

# ШЭДЭЎРЫ ТРАЦЦЯКОЎСКАЙ ГАЛЕРЭІ ЖЫВАПІС XVIII – пач. XX ст.

1856
Государственная
Третьяковская
галерея

Мінск 2003

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі

Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь

Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі

Дзяржаўная Траццякоўская галерэя

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

# ШЭДЭЎРЫ ТРАЦЦЯКОЎСКАЙ ГАЛЕРЭІ
# ЖЫВАПІС XVIII – пач. XX ст.

BRITISH AMERICAN TOBACCO

Дорогие друзья!

Сердечно приветствую посетителей и организаторов выставки произведений живописи из собрания Государственной Третьяковской галереи на белорусской земле.

Российско-белорусское культурное сотрудничество, имеющее в основе своей не только историческое, но и духовное родство братских славянских народов, является тем связующим стержнем, который объединяет наши народы.

Не сомневаюсь, что выставка станет заметным явлением в культурной жизни Беларуси, ярким свидетельством неиссякаемой творческой силы наших стран.

Позвольте пожелать организаторам выставки успеха на земле Беларуси, а зрителям – истинного эстетического наслаждения от общения с искусством выдающихся мастеров кисти и незабываемых впечатлений.

*Министр культуры*
*Российской Федерации* *М. Швыдкой*

Выстаўка твораў вядомых рускіх мастакоў XVIII - пачатку XX стагоддзя з калекцыі Дзяржаўнай Трацццякоўскай галерэі ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь – вельмі значная падзея ў культурным і палітычным супрацоўніцтве нашых краін, яна з'яўляецца яркім прыкладам дружбы нашых народаў.

Развіццё беларускага выяўленчага мастацтва на працягу некалькіх стагоддзяў было цесна звязана з рускай мастацкай школай. Многія нашы айчынныя творцы атрымалі мастацкую адукацыю ў Расіі, сфарміраваліся пад уплывам дасягненняў рускіх мастакоў, што значна ўзбагаціла іх светапогляд, пашырыла творчыя далягляды і разам з тым паспрыяла больш глыбокаму філасофскаму і мастацкаму асэнсаванню сваёй нацыянальна-культурнай індывідуальнасці.

Выстаўка "Шэдэўры Трацццякоўскай галерэі" – яркі прыклад плённага супрацоўніцтва, абмену мастацкімі каштоўнасцямі нашых музеяў і набыткамі культур нашых братніх народаў.

*Міністр культуры*
*Рэспублікі Беларусь* *Л. Гуляка*

Дорогие друзья,

Открытие выставки "Шедевры Третьяковской галереи", которая в течение полугода будет экспонироваться в Национальном художественном музее Республики Беларусь, – яркий и конкретный пример российско-белорусского культурного сотрудничества, укрепления и сохранения духовных взаимосвязей наших народов, расширения творческих контактов между деятелями культуры и искусства Российской Федерации и Республики Беларусь.

Выставка произведений живописи великих русских художников XVIII – начала XX веков является не только знаковым утверждением и результатом дружественных связей Государственной Третьяковской галереи и Национального художественного музея Республики Беларусь, но и выражением наших особых чувств дружбы талантливому белорусскому народу.

Уверен, что это значительное культурное событие в жизни наших стран станет важным фактором дальнейшего единения народов России и Беларуси.

*Чрезвычайный и Полномочный*
*Посол Российской Федерации*
*в Республике Беларусь* *А. Блохин*

Дорогие друзья,

Государственная Третьяковская галерея имеет прочные связи с Беларусью. Еще во второй половине XIX века в собрании основателя Галереи П.М.Третьякова достойное место заняли произведения художников, уроженцев Беларуси И.Ф.Хруцкого и С.К.Зарянко.

В полотнах великих русских художников И.Е.Репина, И.И.Шишкина, Ю.Ю.Клевера, принадлежащих и собранию Третьяковской галереи, и собранию Национального художественного музея Республики Беларусь, запечатлены удивительные по своему лиризму и умиротворенному очарованию уголки белорусской природы.

Наше собрание русского искусства XX века трудно представить без работ таких сыновей белорусской земли, как В.К.Бялыницкий-Бируля, Г.Г.Нисский, Е.Е.Моисеенко.

Мы гордимся представительной коллекцией современного белорусского искусства, включающей произведения Г.Х.Ващенко, В.А.Громыко, М.А.Савицкого и многих других талантливых белорусских художников.

Выставка картин из собрания Государственной Третьяковской галереи дает возможность белорусским ценителям прекрасного увидеть не только классические, широко известные произведения русской живописи периода ее наивысшего расцвета, но и сравнительно недавно приобретенные нашим музеем высококачественные работы русских художников.

В Беларуси прекрасно знают и любят русское классическое искусство, поэтому я уверен, что эта выставка найдет своего благодарного зрителя.

*Генеральный директор*
*Государственной Третьяковской*
*галереи* *В. Родионов*

Выстаўка шэдэўраў рускіх мастакоў з сусветна вядомай Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі – не толькі даніна павагі нашых расійскіх калег братняму беларускаму народу, але разам з тым і сведчанне асаблівых, цёплых адносін да нашага музея, які мае гонар пазнаёміць беларускую грамадскасць з лепшымі ўзорамі вялікай рускай жывапіснай школы трох стагоддзяў.

Прыемна адзначыць, што гэта выстаўка – першы важкі крок у новым тысячагоддзі на шляху нашага плённага творчага супрацоўніцтва ў самых розных напрамках музейнай справы.

*Дырэктар*
*Нацыянальнага мастацкага*
*музея Рэспублікі Беларусь* *У. Пракапцоў*

Траццякоўская галерэя – адна з найбольш вядомых і значных музейных скарбніц свету. Гісторыя Траццякоўскай галерэі пачынаецца з 1856 года, калі малады маскоўскі купец Павел Міхайлавіч Траццякоў (1832–1898) набыў дзве першыя карціны, якія паклалі пачатак яго збіральніцкай дзейнасці. На працягу сарака з лішнім гадоў ён нястомна набываў творы рускіх мастакоў, стварыўшы калекцыю, якая не мела сабе роўных у Расіі XIX стагоддзя. Яшчэ ў 1860 годзе малады збіральнік сфармуляваў сваю галоўную мэту: «Для меня, истинно и пламенно любящего живопись, не может быть лучшего желания, как положить начало общественного, всем доступного хранилища изящных искусств, принесущего многим пользу, всем удовольствие... Я желал бы оставить национальную галерею. То есть состоящую из картин русских художников». Усё далейшае жыццё П.М. Траццякова было прысвечана здзяйсненню гэтай высакароднай мэты.

У 1892 годзе ўвесь свой збор разам з невялікай, але грунтоўна адабранай калекцыяй заходнееўрапейскага жывапісу памерлага брата Сяргея Міхайлавіча Траццякоў падараваў Маскве. У гэты час збор налічваў крыху менш за 2000 твораў. Зараз калекцыя галерэі мае каля 100 тысяч твораў жывапісу, малюнка, скульптуры. На выстаўцы ў Мінску прадстаўлены творы буйнейшых майстроў айчыннага жывапісу трох стагоддзяў, набытыя як заснавальнікам галерэі, так і зусім нядаўнія паступленні, што з'яўляецца сведчаннем пастаяннага, актыўнага жыцця Траццякоўскай галерэі.

XVIII стагоддзе ўвайшло ў гісторыю рускага мастацтва як час бліскучага росквіту партрэтнага жывапісу. Адным з самых натхнёных жывапісцаў гэтага часу быў Ф.С. Рокатаў (1735/?/–1808). Вобразы, створаныя мастаком, прыцягальныя ўнутранай годнасцю, задушэўнасцю і паэтычнай пранікнёнасцю ("Партрэт А.С. Тулінавай". Канец 1770-х.). Творам Дз.Г. Лявіцкага (1735 – 1822) уласціва паўната жыццёвай характарыстыкі і бляск жывапіснага майстэрства ("Партрэт Н.І. Мельгуновай". 1770-я; "Партрэт флігель-ад'ютанта А.Дз. Ланскога". 1780). У.Л. Баравікоўскім (1757–1825) створана прывабная галерэя жаночых вобразаў, у якіх найбольш поўна адлюстраваны ідэі рускага сентыменталізму («Партрэт невядомай у блакітным шалі". 1795).

З імем А.А. Кіпрэнскага (1782–1836) звязана ўяўленне аб пушкінскай эпосе, аб часе рамантызму ў рускім мастацтве. У "Партрэце князя А.М. Галіцына" (каля 1819) раскрываецца стрымана-гераічны і ўзвышана-паэтычны вобраз партрэтаванага. Рамантычны настрой эпохі адлюстраваўся і ў пейзажах С.Ф. Шчадрына (1791–1830), пранікнёных тонкай паэзіяй і лірызмам ("Від Амальфі". 1827–1828).

На выстаўцы прадстаўлены эцюды да славутага палатна А.А. Іванава (1806–1858) "З'яўленне Хрыста народу" (1837—1857), у якіх знайшлі адлюстраванне пошукі вобразна-псіхалагічнай ісціны, да чаго імкнуўся майстар усё сваё жыццё.

Рэалістычны жывапіс у яго крытычнай накіраванасці бярэ пачатак у творчасці П.А. Фядотава (1815–1852). Яго невялікія карціны, намаляваныя на сюжэты паўсядзённай рэчаіснасці, зацвердзілі бытавы жанр у рускім мастацтве як раўнапраўны сярод іншых жанраў ("Пераборлівая нявеста". 1847).

Крытычны рэалізм атрымаў сваё найбольш поўнае развіццё ў творчасці выдатных майстроў другой паловы XIX стагоддзя. Прызнаным майстрам дэмакратычнага руху ў рускім жывапісе гэтых дзесяцігоддзяў быў І.М. Крамской (1837–1887), які ўзначаліў у 1870 годзе Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. Выдатны партрэтыст-псіхолаг Крамской лічыў галоўным паказаць чалавека з пункту гледжання яго маральных перакананняў, даць яму "грамадзянскую атэстацыю" ("Партрэт М.Б. Тулінава". 1868; "Партрэт С.П. Боткіна". 1881; "Акцёр А.П. Ленскі ў ролі Пятручыо". 1883).

У творчасці В.І. Сурыкава, В.М. Васняцова, В.Дз. Паленава, І.І. Левітана рэалізм другой паловы XIX стагоддзя атрымаў даўно жаданае ўз'яднанне праўды жыцця і прыгажосці жывапісу. Выключны талент В.І. Сурыкава (1848–1916) праявіўся перш за ўсё ў яго грандыёзных гістарычных палотнах. Эцюды да яго жывапісных драм з'яўляюцца, па сутнасці, паўнакроўнымі партрэтамі, у якіх увасоблена сіла характару і вышыня духу, як, напрыклад, выключны па сваёй выразнасці эцюд "Галава баярыні Марозавай".

"Гістарычным жывапісцам на крыху фантастычны лад" называў сябе В.М. Васняцоў (1848–1926). У народнай

творчасці, народнай фантазіі мастак шукаў асаблівасці нацыянальнага характару ("У касцюме скамароха". 1882).

Пейзажны жывапіс займаў выключнае месца ў творчасці мастакоў другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. Праз пейзаж адбывалася "спазнаванне" не толькі вобліку роднай прыроды, але і вытокаў духоўнага і эмацыянальнага жыцця народа. Простыя, сціплыя пейзажныя матывы ў карцінах А.К. Саўрасава (1830–1897)ператвараюцца ў адухоўленыя вобразы, афарбоўваюцца тонкім лірычным пачуццём. В.Дз. Паленаў (1844–1927) – мастак шырокіх творчых інтарэсаў, але гледачам Паленаў усё ж бліжэй як пейзажыст. У пейзажах мастак стварае стройны паэтычны свет, прасякнуты прыгажосцю і супакаеннем ("Сажалка ў Абрамцаве". 1883). І.І. Левітан (1860–1900) праз пейзажныя вобразы выразіў складаны, зменлівы свет душы чалавека, яе стан і настрой ("На Волзе". 1888; "Ціхі прыстанак". 1890; "Над вечным супакоем". Эскіз. 1890-я). Па сваім светаадчуванні Левітан схіляўся да новага пакалення жывапісцаў, якія сваёй творчасцю адкрывалі XX стагоддзе.

Для многіх майстроў пачатку XX стагоддзя побач з захаваннем сацыяльнай праблематыкі, уласцівай папярэднім дзесяцігоддзям, характэрны пошукі новай жывапіснай выразнасці. Матыў цяжкай працы, прозы жыцця адлюстраваны ў ранніх творах А.Я. Архіпава (1862–1930) ("Падзёншчыцы на чыгуналіцейным заводзе". 1895). Але адначасова ўзнікае "віхурная" жывапісная стыхія карцін Ф.А. Малявіна (1869–1940) ("Віхура". Эскіз. 1905). Пленэрныя імпрэсіяністычныя пейзажы С.А. Вінаградава (1869–1938) ("У сядзібе"), прасторавыя сядзібныя інтэр'еры С.Ю. Жукоўскага (1873–1944) працятыя адчуваннем скрытнай прысутнасці чалавека ("Пакой у маёнтку "Брасава". 1916). Самым значным і яркім прадстаўніком імпрэсіянізму з'яўляецца К.А. Каровін (1861–1939). Яму ўласціва найтанчэйшае пачуццё колеру, разуменне яго дэкаратыўнасці і ўменне ў эцюдах, партрэтах, пейзажах ствараць свет, уцешны і прыгожы («Ля расчыненага акна». 1916). Сярод найбольш яркіх майстроў, якія сваім мастацтвам вызначылі эпоху, атрымаўшую назву «сярэбранага века», можна назваць В.А. Сярова, К.А. Каровіна, М.В. Несцерава («Партрэт Кацярыны Пятроўны Несцеравай за вышываннем». 1909), В.Э. Барысава-Мусатава («Дзяўчына з агавай». 1897). Гарманічную сувязь чалавека з навакольным светам перадаў малады мастак В.А. Сяроў (1865–1911) у партрэтах блізкіх і любімых ім людзей («Ля акна». 1886). У яго творчасці знайшлі адлюстраванне важнейшыя этапы развіцця рускага мастацтва – ад традыцый перасоўнікаў да пластычных адкрыццяў мадэрна («Русалка». 1896).

Мяжа XIX–XX стагоддзяў – час узнікнення мноства груповак і мастацкіх плыняў: "Мир искусства", СРХ, «Голубая роза» і інш. У творах П.П. Канчалоўскага (1876–1956), які ўваходзіў у аб'яднанне "Бубновый валет", прысутнічае моцны жывапісны тэмперамент. Яго партрэты, пейзажы, нацюрморты напісаны з крайнім абагульненнем формы і колеру, іх вылучае актыўная экспрэсія ("Дыні". 1912).

З імёнамі М.Ф. Ларыёнава (1881–1964) і Н.С. Ганчаровай (1881–1962) звязана нараджэнне рускага авангарда. Ларыёнаў аб'яднаў вакол сябе групу таленавітых аднадумцаў, сярод якіх першае месца па сіле таленту займала яго жонка Наталля Ганчарова ("Нацюрморт. Кветка і вінаград"). У 1900-я гады мастак звяртаецца да бытавога жанру ў яго "паніжаным" варыянце ("Правінцыяльны франт". Каля 1909), дзе выкарыстоўвае мову і прыёмы лубка, шыльды, народнай цацкі.

Дзяржаўная Траццякоўская галерэя прадстаўляе ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь выбраныя шэдэўры са свайго збору. На працягу доўгага часу паміж музеямі існуюць творчыя сувязі: неаднойчы наладжваліся сумесныя выстаўкі, адбываўся абмен творамі мастацтва са збораў музеяў. Але ўпершыню буйнейшым музеем Расіі для экспанавання ў сталіцы Беларусі прадстаўлена такая значная частка калекцыі жывапісу XVIII – пачатку XX стагоддзя.

*Галіна Чурак*

*загадчык аддзела*
*жывапісу другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя*
*Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі*



Рокатаў Ф.С.
Партрэт князя Дз. М. Галіцына. 1760-я



Рокатаў Ф.С.

Партрэт А.С.Тулінавай. Канец 1770-х



Фядотаў П.А.
Пераборлівая нявеста. 1847



Крамской І.М.
Партрэт С.П. Боткіна. 1881



Левітан І.І.
Ціхі прыстанак. 1890



Сурыкаў В.І.
Партрэт Л.Т. Маторынай. Казачка. 1892



Саўрасаў А.К.
Лес у шэрані. Канец 1880 – 1890-я



Міліоці М.Дз.
Пастараль. 1905



Сяроў В.А.
Ля акна. Партрэт В.Ф. Трубнікавай. 1886



Юон К.Ф.
Сіні домік. "Пятроўскае". 1916



Сомаў К.А.
Маладая жанчына, якая спіць у парку. 1922

# Каталог

**Аляксееў Ф.Я.** 1753–1824
Саборная плошча ў Маскоўскім Крамлі
Палатно, алей. 81,7 x 112

**Анісфельд Б.І.** 1878–1973
Зялёны эцюд (Поўдзень). 1906
Палатно, тэмпера. 100,5 x 88

**Арлоў П.М.** 1812–1863
Партрэт Карла фон Кубэ (?) з сабакам. 1840
Палатно, алей. 55 x 49,7

**Архіпаў А.Я.** 1862–1930
Падзёншчыцы на чыгуналіцейным заводзе. 1895
Палатно, алей. 44,7 x 87

**Баравікоўскі У.Л.** 1757–1825
Партрэт невядомай у блакітным шалі. 1795
Палатно, алей. 68 x 54,2

Партрэт вялікай княжны Аляксандры Паўлаўны. 1798
Палатно, алей. 68 x 55

**Барысаў-Мусатаў В.Э.** 1870–1905
Дзяўчына з агавай. 1897
Эцюд для няздзейсненай карціны "Matérnite"
Палатно, алей. 97,5 x 67

**Браз І.Э.** 1872–1936
Партрэт мастака С.В. Іванава. 1903
Палатно, алей. 91,7 x 68,7

**Брулоў К.П**. 1799–1852
Партрэт П.І. Крыўцова. 1844
Палатно, алей. 96,3 x 75,2

**Бурлюк Д.Д.** 1882–1967
Вясна. Першая чвэрць XX ст.
Палатно, алей. 67 x 75

**Вараб'ёў М.Н.** 1787–1855
Італьянскі від ноччу. 1847
Палатно, алей. 48,5 x 68

**Васняцоў В.М.** 1848–1926
У касцюме скамароха. 1882
Палатно, алей. 66,5 x 52,2

**Верашчагін В.В.** 1842–1904
Палітыкі ў опіумнай крамцы. Ташкент. 1870. Эцюд
Палатно, алей. 67,8 x 47,1

**Вінаградаў С.А.** 1869–1938
У сядзібе
Палатно, алей. 56,3 x 71

**Ганчарова Н.С.** 1881–1962
Нацюрморт. Кветка і вінаград
Палатно, алей. 55,4 x 46,2

**Ге М.М.** 1831–1894
Партрэт пісьменніка А.А. Пацехіна. 1876
Палатно, алей. 107 x 79,8

**Жукоўскі С.Ю.** 1873–1944
Пакой у маёнтку "Брасава". 1916
Палатно, алей. 80,7 x 107,5

**Іванаў А.А.** 1806–1858
Вада і камяні пад Палаццуола, паблізу Фларэнцыі
Палатно, алей. 45 x 60,9

Галава нявольніка
Папера на палатне, алей. 45 x 34

**Іваноў А.І.** (Галубой). 1818–1863
Рускія песеннікі ў Рыме. 1862
Палатно, алей. 76 x 62

**Канчалоўскі П.П.** 1876–1956
Дыні. 1912
Палатно, алей. 97,5 x 112

**Каровін К.А.** 1861–1939
Ля расчыненага акна. 1916
Палатно, алей. 87,5 x 67

**Кіпрэнскі А.А.** 1782–1836
Партрэт князя А.М. Галіцына. Каля 1819
Палатно, алей. 97,3 х 74,5

**Крамской І.М.** 1837–1887
Партрэт М.Б. Тулінава. 1868
Палатно, алей. 118 х 82,6

Партрэт С.П. Боткіна. 1881
Палатно, алей. 111 х 92

Акцёр А.П. Ленскі ў ролі Пятручыо. 1883
Палатно, алей. 62 х 53,5

**Ларыёнаў М.Ф.** 1881–1964
Правінцыяльны франт. Каля 1909
Палатно, алей. 100 х 89

**Левітан І.І.** 1860–1900
На Волзе. 1888
Палатно, алей. 57,8 х 88,7

Ціхі прыстанак. 1890
Палатно, алей. 87,5 х 108

Над вечным супакоем. Эскіз. 1890-я
Палатно, алей. 95 х 127

**Лявіцкі Дз.Р.** 1735–1822
Партрэт Н.І. Мельгуновай. 1770-я
Палатно, алей. 59,5 х 46

Партрэт флігель-ад'ютанта А.Дз. Ланскога. 1780
Палатно, алей. 62,8 х 49,7

**Лянтулаў А.В.** 1882–1943
Парыж. 1911
Кардон, алей. 73,3 х 74,3

**Малявін Ф.А.** 1869–1940
Віхура. Эскіз. 1905
Палатно, алей. 75,3 х 121

**Машкоў І.І.** 1881–1944
Пейзаж са стрэхамі дамоў. 1914
Палатно, алей. 72 х 99,2

**Міліоці М.Дз.** 1874–1962
Пастараль. 1905
Палатно, тэмпера. 46 х 37,6

**Мохаў М.А.** 1819–1903
Вялікдзень. 1842
Палатно, алей. 146,3 х 112.3

**Несцераў М.В.** 1862–1942
Партрэт К.П. Несцеравай за вышываннем. 1909
Кардон, алей. 43 х 60

**Паленаў В.Дз.** 1844–1927
Цэзарская забава. 1879
Палатно, алей. 136 х 93,4

Сажалка ў Абрамцава. 1883
Палатно, алей. 67 х 101

**Рокатаў Ф.С.** 1735(?)–1808
Партрэт князя Дз.М. Галіцына. 1760-я
Палатно, алей. 62,7 х 51,8

Партрэт А.С. Тулінавай. Канец 1770-х
Палатно, алей. 59,3 х 46

Партрэт невядомай у белай сукенцы з карункамі. Канец 1780-х
Палатно, алей. 73 х 62,5 (авал)

**Сарокін Я.С.** 1821–1892
Партрэт дзяўчыны з кнігай. 1860
Палатно, алей. 65 х 53,5

**Саўрасаў А.К.** 1830–1897
Дворык. Зіма. 1870-я
Палатно, алей. 53 х 43

Лес у шэрані. Канец 1880–1890-я
Палатно, алей. 109 х 80

**Сомаў К.А.** 1869–1939
Маладая жанчына, якая спіць, у парку. 1922
Палатно, алей. 29 х 45

**Судзейкін С.Ю.** 1882–1946
Кветкі ў глінянай вазе. 1910-я
Палатно, алей. 105 х 73

**Сурыкаў В.І.** 1848–1916
Сцэна з рымскага карнавалу. 1884
Палатно, алей. 108 х 93

Партрэт Л.Т. Маторынай. Казачка. 1892
Палатно, алей. 86 х 68

Галава баярыні Марозавай.
Палатно, алей. 48,2 х 35,7

**Сяроў В.А.** 1865–1911
Ля акна. Партрэт В.Ф. Трубнікавай. 1886
Палатно на кардоне, алей. 74,5 х 56,3

Русалка. 1896
Палатно, алей. 132 х 144

**Тархаў М.А.** 1871–1930
Вуліца прадмесця Сен-Марцен у Парыжы. 1901
Кардон на палатне, тэмпера. 78 х 51

**Торапаў Ф.Г.** 1821–1898
Нацюрморт. Сярэдзіна XIX стагоддзя
Палатно, алей. 80,5 х 98,6

**Фядотаў П.А.** 1815–1852
Пераборлівая нявеста. 1847
Палатно, алей. 37 х 45

**Хруцкі І.Ф.** 1810–1885
Да святога месца. 1845 – 1850-я
Палатно, алей. 40,7 х 50,5

**Шаўчэнка А.В.** 1882–1948
Прачкі. 1913
Кардон, алей. 60,3 х 70,7

**Шчадрын С.Ф.** 1791–1830
Від Амальфі. 1827–1828
Палатно, алей. 44 х 61,5

**Юон К.Ф.** 1875–1958
Сіні домік. "Пятроўскае". 1916
Палатно, алей. 67,5 х 94

BRITISH AMERICAN TOBACCO

Мировой лидер по производству табачных изделий – компания BRITISH AMERICAN TOBACCO – осуществляет свою деятельность во всем мире и успешно строит свои деловые отношения с представителями самых разных культур. Сегодня портфель BRITISH AMERICAN TOBACCO насчитывает порядка 300 торговых марок, которые поставляются в 180 стран мира. Являясь международной со дня своего основания и постоянно развивая собственные социальные программы, компания всегда принимает активное участие в жизни общества тех стран, где существуют ее Представительства.

Представительство BRITISH AMERICAN TOBACCO в Республике Беларусь работает уже 7 лет. Успех торговых марок Kent, Lucky Strike, Pall Mall, «Ява Золотая» подтверждает, что и в Беларуси компания воплотила свои основные принципы работы: открытость, ответственность, новаторское отношение к бизнесу, внимательное отношение к местным особенностям.

Жителям республики уже хорошо известно об активной позиции BRITISH AMERICAN TOBACCO в области поддержки культурных проектов. Компания постоянно организует и финансирует совместные программы с Национальным художественным музеем Республики Беларусь. В рамках этого сотрудничества BRITISH AMERICAN TOBACCO представляет новый уникальный проект. Впервые в Беларуси экспонируется столь полная коллекция Государственной Третьяковской галереи – 60 работ известнейших русских живописцев. Эту выставку без преувеличения можно назвать настоящим событием в культурной жизни Беларуси.

Компания выражает признательность всем, кто помогал в организации этой экспозиции, и надеется, что впереди еще много проектов, обогащающих культурную жизнь белорусского общества.

Э. Грамович
Глава Представительства
BRITISH AMERICAN TOBACCO